ЗАЦВЕРДЖАНА
Дырэктар дзяржаўнай установы культуры змешанага тыпу «Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур»
__________ Якабсон В.В.
«03» ____01____2025г.

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб конкурсе сярод грамадскіх арганізацый беларускіх суайчыннікаў за мяжой на лепшыя дасягненні ў арганізацыі і рэалізацыі праектаў па папулярызацыі беларускай культуры ў краінах пражывання беларускай дыяспары (конкурс "КУЛЬТУРА")

### Асноўныя мэты і задачы конкурсу

— прыцягненне грамадскіх арганізацый за мяжой да папулярызацыі культурнай спадчыны беларускага народа і сучасных дасягненняў Рэспублікі Беларусь у галіне культуры ў краінах іх пражывання;
— падтрымка праектаў «народнай дыпламатыі» ва ўмацаванні станоўчага іміджу Беларусі і беларускага народа ў свеце;
— падтрымка і заахвочванне арганізацый беларускіх суайчыннікаў за мяжой у ажыццяўленні імі культурна-асветніцкай дзейнасці па захаванні і папулярызацыі беларускай культурнай спадчыны ў свеце;
— садзейнічанне актывізацыі наладжвання канструктыўных кантактаў узаемакарыснага супрацоўніцтва зацікаўленых у Беларусі з беларускімі суайчыннікамі за мяжой па развіцці і рэалізацыі праектаў па папулярызацыі культурнай спадчыны беларускага народа;
— падтрымка і папулярызацыя мерапрыемстваў, накіраваных на наладжванне міжкультурных праектаў дзяржаўных устаноў культуры Рэспублікі Беларусь і грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа.

### Заснавальнік конкурсу

Дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу «Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур» (далей — Цэнтр).

### Удзельнікі конкурсу

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца грамадскія арганізацыі, якія функцыянуюць за мяжой і здзяйсняюць культурныя праекты па папулярызацыі беларускай культуры.

### Агульныя палажэнні

1. **Матэрыялы і тэрміны.**

1.1. Матэрыялы да конкурса — інфармацыя, якая адлюстроўвае культурную дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў за каляндарны год.

1.2. Заяўкі і матэрыялы на ўдзел у конкурсе накіроўваюцца ў Цэнтр да 15 сакавіка года, наступнага за справаздачным каляндарным годам.

1.3. Дасылаць матэрыялы (у тым ліку разам з аўдыё-, фота- і відэададаткамі) можна як у электронным выглядзе, так і поштай (на электронным носьбіце або ў выглядзе афармленага раздрукаванага зборніка). Прымаюцца да ўдзелу матэрыялы ў фармаце doc, docx, pdf, rtf. Спасылкі дапушчальны на аўдыё-, фота- і відэададаткі. Тэкставыя матэрыялы на конкурс, якія дасылаюцца ў электронным выглядзе, павінны быць прадстаўлены адным дакументам ў адным пісьме. Форма заяўкі адвольная, з дакладнымі звесткамі пра кіраўніка грамадскага аб'яднання, поўнай дакладнай назвай грамадскага аб'яднання, кантактнай інфармацыяй (адрас, тэлефон, e-mail). Заяўкі і матэрыялы да ўдзелу ў конкурсе накіроўваюцца ў Цэнтр на электронны адрас centr@nationalcultures.by або rcnk.bel@gmail.com, поштай 220029, г. Мінск, вул. Чычэрына, 19, пам.105.

1.4. Апрацоўка прадстаўленых удзельнікамі фактычных матэрыялаў аб рэалізацыі імі значных культурных праектаў за мяжой (у конкурсным каляндарным годзе) і падвядзенне вынікаў здзяйсняецца на працягу месяца з моманту спынення прыняцця заявак.

1.5. Конкурсныя матэрыялы і вынікі конкурсу могуць прадастаўляцца СМІ Беларусі і выкарыстоўвацца як метадычны матэрыял (з захаваннем спасылак на аўтараў) з моманта іх атрымання арганізатарамі конкурса.

## 2. Умовы адбору.

2.1. Спіс удзельнікаў фарміруецца з ліку тых, хто падаў пісьмовую заяўку на ўдзел у конкурсе. Да заяўкі прыкладаецца агульная інфармацыя пра фактычна здзейсненную працу, яе значнасць і выніковасць, і дадаткі, якія дакументальна гэта падцвярджаюць.

2.2. Матэрыялы конкурсу павінны даступна распавядаць пра культурную дзейнасць аб'яднання. Падцвярджальнымі матэрыяламі з'яўляюцца: аўдыё-, фота- і відэаматэрыялы; спасылкі на публікацыі ў СМІ; узнагароды; пагадненні аб супрацоўніцтве; метадычныя напрацоўкі і іншае.

2.3. Адбор і фарміраванне спісу лаўрэатаў конкурсу ажыццяўляецца згодна з дасланымі матэрыяламі, якія адпавядаюць патрабаванням палажэння, адлюстроўваюць найбольш станоўчыя і маштабныя вынікі праектаў.

2.4. Чакаемыя вынікі — умацаванне станоўчага аўтарытэту грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа ў краінах пражывання, межкультурнага дыялогу, павышэнне іміджа Рэспублікі Беларусь на культурнай арэне, папулярызацыя беларускай культуры.

## 3. Прызавы фонд і ўзнагароджанне

3.1. Набыццё заахвочвальных прызоў забяспечвае Цэнтр. Дыпломамі, прызамі ўзнагароджваюцца лепшыя ўдзельнікі конкурсу.

3.2. Уручэнне прызоў лепшым удзельнікам конкурсу здзяйсняецца Цэнтрам або дзяржаўнымі установамі Рэспублікі Беларусь у краінах знаходжання беларускіх суайчыннікаў.

## 4.Кантакты.

Дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу «Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур»
220029, г. Мінск, вул. Чычэрына, 19, пам. 105
e-mail: centr@nationalcultures.by, rcnk.bel@gmail.com
тэл. + 375 (17) 270-82-67, + 375 (17) 395-96-03